

*Іказненскі касцёл Божага Цела.*

**ІКА́ЗНЕНСКІ КАСЦЁЛ БО́ЖАГА ЦЕ́ЛА**, помнік архітэктуры неараманскага стылю ў в. Іказнь Браслаўскага р-на. Пабудаваны ў 1905 з вапнавых блокаў і цэглы. Храм базілікальнага тыпу з трансептам, завершаны паўкруглай апсідай. Нефы перакрыты крыжовымі скляпеннямі. Гал. фасад 2-вежавы. Вежы квадратнага сячэння, завершаны шатрамі, прарэзаны аконнымі праёмамі разнастайных форм (прамавугольнымі і здвоенымі арачнымі біфорыумамі, арачнымі трыфорыумамі). Паміж вежамі — трохвугольны шчыпец з акном-ружай у цэнтры. Над арачным парталам — трыфорыум. Па перыметры храм узмоцнены 3-ступенчатымі контрфорсамі. Бакавыя фасады і завяршэнні трансепта з высокімі арачнымі аконнымі праёмамі. Пластыку фасадаў узмацняюць аркатурныя паясы. У інтэр'еры 3 алтары, цэнтр. — драўляны, 3-ярусны. Тэр. храма абнесена агароджай з бутавага каменю. Касцёл дзейнічае.

*Ю.Ю.Захарына.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ